Арцём Кавалеўскі

# АДМЫСЛОВЫЯ ГУЛЬНІ



Арцём Кавалеўскі

# АДМЫСЛОВЫЯ ГУЛЬНІ



*...прасачыце за трымценнем, колераззяннем і палётам МЫсЛЬэНЫХ булькаў, створаных вашай свядомасцю.*

*Творы Арцёма рытмізаваныя, музыкальныя, і падаецца, што гэткім дзіўным чынам на паперы запісаныя мелодыі, таму справядліва назваць паэта кампазітарам вершаў...*

*Серж Мінскевіч*

Арцём Кавалеўскі

* * *

Ноч атрымала
Прэмію
Нобеля
За мой
Недарэчны
Шчаслівы
Сон.



Менск
Логвинов
2003

## Арцём Кавалеўскі

# АДМЫ**СЛОВЫ**Я
# ГУЛЬНІ

вершы



УДК 882.6-31
ББК 84 (4 Беи)
К 56

Бібліятэка «Бум-Бам-Літа»

**Кавалеўскі А.**
**К 56** Адмысловыя гульні: Вершы/А. Кавалеўскі. — Мн.: И. П. Логвинов, 2003. — 184 с.

ISBN 985-6701-16-3.

У першую кнігу Арцёма Кавалеўскага ўвайшлі вершы, створаныя паэтам на працягу 1995–2003 гадоў.

За паўпразрыстым вэлюмам тонкіх алітэрацыяў, за шырмаю нечаканых сэнсавых спалучэнняў і шматколерных метафар, за шэрагам дзіўных расхрыстаных асацыяцыяў хаваецца выключная паэтычнасць радка.

Чытач трапляе ў прастору адмысловых слоўных гульняў, дзе сола ўласных спеваў паэта апавядае пра тое, што адбываецца кожную хвіліну па-за межамі нашай будзённай свядомасці...

**УДК 882.6-31**
**ББК 84 (4 Беи)**

ISBN 985-6701-16-3

© Арцём Кавалеўскі, 2003
© Логвинов И., афармленне, 2003

# ВЕРШАПОГЛЯД АРЦЁМА КАВАЛЕЎСКАГА

Падалося, што сто семдзесят старонак Арцёмавых вершаў пранесліся на блізкай адлегласці ад мяне, як хуткі цягнік у XIX стагоддзі міма правінцыялкі, якая выйшла збіраць рамонкі ў поле. Сто семдзесят вагонаў, напоўненых паэзіяй, спяшаліся на час да пэўнай станцыі. А я ганарылася, страціўшы навык мовы, бо стаяла так блізенька, што ветрык шкамутаў маю бляклую сукенку, што класічныя рамонкі, сабраныя ў класічны букет, захоплена разляцеліся за цягніком і пакорліва клаліся яму пад колы. Арцём быў рулявым. Ён памахаў мне рукою. Цягнік смела ішоў па леце. Паэзія – гэта тое ўражанне, што засталося.

Але Арцём прыйшоў да мяне і сказаў: "Іна-Планецянка, напішы, хто сядзеў у вагонах".

– Так, я бачыла, – сказала я. – Паспела разгледзець.

У вагоне-рэстарацыі падавалі салёна-шалёны цытрынавы суп. "Было," – скамячыўся Арцём ад сарамлівасці, бо рэцэпт быў ягоны.

Там быў дрывасек, што сек секвою. "Быў," – пацвердзіў Арцём, згадваючы.

Там араў раллю раялю Шапэн і крычаў Пётру Пэну: "Ша! Шакаладны школьнік!". "І гэта ты заўважыла," – усмешліва пацвердзіў Арцём.

У дзесятым вагоне ехаў сляпы Гамер. "Я прапанаваў яму гэты тварог твораў у якасці дыетычнага прадукту эстэтыкі," – патлумачыў Арцём.

А яшчэ там была дзеўкаватая чына, якая пачынаючымі рукамі намагалася расчыніць акно,

бо яе скура, як сакура, відавочна марнела без краявідаў. "Я кахаў яе калісьці. Я кахаў гэтую зледзянелую маўклівую гадаўку", – вызнаў Арцём, і ўспамін пра скуру дзеўкаватай чыны разліў па ягоных шчоках колер сакуры.

– Калі смак і смурод паветра, змешанага з дымам і думамі, ажыццявілі жыццё, яе пачынаючыя рукі знайшлі рухомасць, – дадала я з елкасцю.

– Паветраныя хвалі хвалявалі яе і хавалі. Але не з гэтага трэба пачынаць паэтычны зборнік! Спачатку хай Шапэн, яна – праз момант, – бараніўся Арцём і прабаваў парваць на кавалкі мае слоўныя малюнкі.

– Паэзія – гэта кулінарнае мастацтва галоднага, – катэгарычна заштэмплявала я, пырскаючы слінай. – Паслухай, што я табе скажу: ЯНА ДАЛА ДАЛОНІ ДОЛУ ДА ЛОНА... Чуеш?

– ГЭТА ДОЛЯ ДАЛОНЯЎ! – прыкра закрычаў Арцём, бо ў ягонай душы пачалася атамная рэакцыя выключнай паэтычнасці радка.

– Так, ты паэт. Ты пракаціў яе бясплатна ў сваім паэтычным цягніку! Каханку сваіх думак. Шчодра, шчодра... Ты Сяргей, але ж яна не Дункан, каб думаць пра яе. У такіх выпадках ванна ванітуе цёплым дождыкам! Разумейся цяпер з Васілём Каменскім, можа ён цябе зразумее, – я адсунулася і адвярнулася прэч.

– Але ж цела стала словам... – прабаваў тлумачыцца Арцём. – Згодна з маімі паэтычнымі законамі стрыечнасць адносінаў між людзьмі павінна перайсці ў сястрычнасць, сястрычнасць у сустрэчнасць, а вернасць павінна ператварыцца ў вечнасць!

Лёгкім крокам кучаравага мужчыны ўвайшоў Васіль Каменскі.

– Яна была адна, ноччу. Яна была адзіночкай. ПОЭЗИЯ – ПРАЗДНИК БРАКОСОЧЕТАНИЯ

слоў, — выдаў Васіль Каменскі сентэнцыю на замежнай мове, бо перакласці асноўны тэзіс яго-най паэзіі без браку было немагчыма. Ён, як аўтарытэт, грымнуўся ў фатэль для допыту маладога паэта.

– Хто вы, Арцёме, маладзік ці маладзён?

– Маладзікі мала дзікія, ім мала дзікасці. Маладзёны малеюць дзённа, ім мала дзён. Я – маладзік.

– Ведаеце, я Вас не чытаў, Вы пазнавата надрукаваліся, як на мой густ. Вызнаеце, Арцёме, што вы пісалі вершы літара за літарай, слова за словам, слупок за слупком, спалучаючы іх недахоп у захапляльны творчы досвед?

– Вызнаю. Адначасова я пакідаў месца на аркушах для малюнкаў. Хай бы чытачы самі малявалі, імправізуючы...

– Як на мой густ, Вы стварылі звычайны футурыстычны слупок. Вызнаеце, Арцёме?

– Але ж гэта не тыя жалезабетонныя па́лі, шаноўны. Гэта не дротавы каркас, запоўнены бетонам. Мае вершы нагадваюць стужку ДНК. Трэба быць генетыкам мовы, каб расчытаць яе і прадубляваць. Мае вершы спадчынна непаўторныя, спадару.

– Вы мінімалізавалі паэзію да адсутнасці каментароў. Вы ўбівалі словы ў трохкутнікі й ромбы, як паштавік пасылкі. А калі Вашыя пасылкі не дойдуць да мэты?

– Я не магу адказваць за бездапаможнае бяскрылле адрасатаў. Я не паштавік. Я кансервую словы ў радковыя слоікі. Я малюю летні дастатак у зімовыя вечары. Прыгажосць маіх вершакарцін можа спазнавацца і без каментароў.

– Чаму Вы не дазволілі чытачу спазнаваць Вашыя вершы ў розных напрамках — знізу ўверх, справа налева, па дыяганалі?

– Вертыкальная мінімалізацыя маіх вершаў нагадвае пырскі вадаспаду, што льюцца не толькі на тых, хто непасрэдна стаіць пад імі, але трапляюць і на аддаленых ад яго ў розных напрамках.

– Каму Вы прысвячаеце сваю паэзію? Ці, можа, Вы хочаце танчыць адзін?

– Што значыць прысвячэнне, калега паэце? Усяго толькі трансфармацыя намінацыі ў дэдыкацыю, то бок Назоўнага склону ў Давальны, ці не? Адкрыйце маю кнігу на назвах вершаў. Пастаўце іх у Давальны склон – гэта і будзе адказам на Вашае пытанне. Слухайце: Стоме, Прапанове, Палёту, Нечаканай усмешцы, Крыжыкам бэзу, Апошняму слову, Уяўнасці, Бярэмю, Бензінавым вясёлкам, Прадчуванню іржавай пары, Самнамбулу, Банальнаму крызісу ўсіх узростаў, Бяскрыллю, Вуснам, Прабачэнню, Трыляменням вардакулета ў кольнутым зыне... калі хочаце... я прысвячаю сваю паэзію.

– Што мне Вам... Што Вам мне... Я сам калісьці грашыў малюнкамі-словамі-тэкстамі. А свой уласны паэтычны крык душы Вы стварылі?

– Даўным-даўно стварыў!

– Гаманіце!

– Не сушы сушы на сушы!

– Станьце вершнікам верша, – заключыў паэт Васіль Каменскі.

Я з павагаю зноў азірнулася да Арцёма. Каменскі абдорыў Арцёма ласкавым вершапоглядам. Адобрыў. Арцём абдорыў мяне сваім вершапоглядам. Я адобрыла. Цягнік смела ішоў па леце.

Спадзяюся, у Лету не кане.

*Інэса Кур'ян*

* * *

Ты сёння не ў гуморы?
Забыць не можаш котку чорную?
І я таксама не магу.
Дык што ж?
Гуляць мы будзем у нуду?
Ці шпацыр мы адновім, як учора?
І зноў пабачым котку чорную.
І будзем не ў гуморы разам.



## Стома

Зусім стомлены,
Я намаляваў сто
Птушак,
Скарыстаўшы стос
Паперы.
Белая столь
Стала небам
Для сотні
Нерэальных істот.
Я забыўся на стому,
Я спаў стоячы,
Тоячы свае
Сапраўдныя
Адчуванні,
Сатканыя з тонкіх
Самотных сноў.



# Дзесьці

— Колькі гадзін?
— Не ведаю, можа, нікольні.
— Як горад завецца?
— А ён безыменны.
— Ці зараз лета?
— Мабыць, бо цёпла.
— Ёсць што паліць?
— Тут не паляць ніколі.
— А выпіць?
— На смагу забыліся тут.
— Тут не плачуць ніколі?
— Не плачуць.
— Не смяюцца?
— Не, не смяюцца.
— А імя, як імя тваё?
— Хтосьці.
— А знаходзімся дзесьці?
— Так, дзесьці.



* * *

Люты.
Людзі.
Люстры
Лужын
Зледзянелых.
Лютым
Позіркам
Глядзіць
У вочы
Вечар.
Крочыць,
Сочыць
Ён за мною,
Злою
Зловіць
Ён мяне
Усмешкай,
Сцежкай
Невядомай
Прывядзе
Кудысьці.
Прывід
Прыйдзе,
Прынясе
Прылады
Для змагання
З жахам;
Я яму не веру –
Зверу,



Веру ў
Дзверы,
Што адчыняцца
Насустрач мне.
Я засну
І ўбачу ў сне,
Як сёння:
Люты,
Людзі,
Люстры
Лужын
Зледзянелых.
Недарэчны
Вечар.



* * *

Хавай
У памяць,
Хавай
У сэрца,
Хавай
За розум,
Хавай,
Куды зможаш,
Нашу апошнюю
Сустрэчу,
Нашу апошнюю
Спрэчку,
Наша апошняе
Ўсё.
Хавай.



# Трохвугольныя нерэальнасці

I

Аб чым гаворыць гэты дзень са мною?
Напэўна, аб зжаўцелых тварах,
Што мітусяцца бясконца
Ў гарадскім натоўпе.
Я стаміўся.
Вечар.

II

Хай хтосьці не пажартуе
З маіх шырокіх крокаў,
З маёй лятаючай
Лунаючай
Постаці,
Добра?

III

У доўгую дарогу збіраюцца людзі
Ад складанасцей розных,
Ад спрэчак дробных.
Мяне не бяруць
З сабою.
Дарма.

IV

А сёння ў каляровым сне я бачыў,
Як павольна падала
Эйфелева вежа.
Парыж гэтаму
Чамусьці
Здзівіўся.
Чаму?

V

Уся асіметрычная пабудова майго цела
Пачынае ператварацца ў цень.
А потым ён знікае.
Я тады падумаў:
“Поўдзень”.
Але – не:
Ноч.



# Дзесяты – Гамер

Першы,
Другі,
Трэці,
Чацвёрты,
Пяты,
Шосты,
Сёмы,
Восьмы,
Дзевяты,
Гамер.



# Прапанова

Давайце возьмем
Усе люстры свету
Ды разаб'ем іх
У адно імгненне.
Хіба патрэбны нам
Пачварныя адбіткі?



## Палёт

Дах пад нагамі,
Хутка – палёт,
Неба рукамі
Кранаю, бы лёд.

Горача думкам,
Нязвыкла вачам:
Радасць палёту
Зямлі не аддам.



## Нечаканая ўсмешка

У вачах, як у сподку з вадою,
Адбіваюцца розныя рэчы,
Ды здзіўляюць яны не мяне,
А таго, хто праходзіць насустрач.
І тады я смяюся нябачна,
Пазіраючы ў вочы таму,
Хто сустрэўся ў дарозе дадому,
Хто здзіўся з аблічча майго.



* * *

На сінім сподку
Неба
Мядовыя цукеркі –
Зоры.
Іх смак–
Нябесна–прыкры
І крышку
Фантастычны,
Але на смак вачэй
Салодкія яны.
Каштуе кожны іх,
Калі сумуе часам.



## Эра Аэра

План
Аэра:
Эра
Аэрапланаў.
Пленэр
Аэра:
Па
Аэрапланах.
Арэна
Аэра:
Аэрапланаванне,
А панаванне
Аэра:
Аэрааэраплаванне.
Аэра
Ў ванне:
Аэраванне.
Аэра
Рана:
Аэраранне.
Аэра
Раны:
Раны
Ў аэраплане.
........................
Аэра–плыні...
Аэра...
Планы...

# Крыжыкі бэзу

*І. Р.*

Крыжыкі бэзу,
Белыя пальцы –
Крыжыкі бэзу
На белых пальцах.
Крыжыкі бэзу,
Нясціплы дотык –
Дотык спасцігне
Нервовы подых.
Крыжыкі бэзу,
Сінія вусны –
На сініх вуснах
Стае спакусы.
Крыжыкі бэзу,
Халодныя вочы –
Рук скрыжаванне:
Рабі, што хочаш.
Крыжыкі бэзу
На мокрых далонях –
Крыжыкі бэзу
Сабраць не здолеў.
Крыжыкі бэзу,
Хуткія словы –
Ты адыходзіш,
Я адыходжу.



## Бярэмя

Бярыце
Бярэмя маё,
Бярыце
Сухімі рукамі.
Бярыце
Бярэмя майго
Нязнанага гвалту.
Хавайце
Бярэмя маё,
Хавайце
Ўрачыста й
Узнёсла.
Хапайце
Бярэмя маё,
Хапайце
(А мо пазайздросцяць?)
Хадзіце
З бярэмем маім,
Хадзіце
Па свеце,
Як дзеці.
Насіце
Бярэмя маё,
Няўмела,
Няўдала
Насіце.

# Кардыялагічна-металічнае ўмяшанне

Паладзіем твару,
Меддзю вачэй,
Цынкам погляду;

Алюмініем ступні,
Латунню рук,
Бронзай кудзераў;

Волавам слёз,
Жалезам гневу,
Чыгуном папроку;

Ртуццю боязі,
Селенам думкі,
Плацінай трымцення,

Мельхіёрам уцёкаў,
Срэбрам жэста,
Уранам слова –

Пракладай трубаправод
Да майго
Залатога сэрца!



## Тры шкельцы

I
Настае маё.
Растае тваё –
Прыкрае.

II
Я –
Яшчарка
Язмінавая.

III
Глобусы.
Сто мільярдаў.
Кожнаму.



## Талеркі,
## ці Нечаканае падабенства

Твой твар нагадвае мне
Талерку,
У якой адбіваецца
(Адбываецца)
Ўсё тое,
Аб чым я мару,
Пра што думаю,
Тое,
Што бачу ў снах,
У высокіх палётах
Маладой яшчэ фантазіі.

Тваe вочы нагадваюць мне
Дзве маленькія талеркі,
У якіх таксама
Адбіваецца ўсё тое,
Што і ў вялізнай талерцы,
Да якой так падобны
Твой твар.

Ты сама нагадваеш мне
Серабрыста-бліскучую
Талерку,
Тую,
На якой часам наведваюць нас
Іншапланетныя істоты.

А мабыць, ты таксама
Іншапланетная?

## Апошняе слова

— Ты чуеш,
Як там –
Далёка –
Гамоняць
Працавітыя
Жоўта-чорныя
Пчолы?

— Не, не чую,
Бо я таксама
Пчала,
Толькі з чалавечым
Тварам.

— А дзе тваё
Джала?

— У маім апошнім слове,—
Сказала Яна –
І памерла.

Я таксама памёр,
Бо пачуў слова
"НЕСАПРАЎДНАСЦЬ".

## Уяўнасць

Азірніся і пабач мяне
У святле электрычнай лямпы.
Прасачы за маім ценем,
Які змяняе форму так хутка,
Што не зразумела: ці цень гэта?
Угледзься ў люстэрка
З маім недарэчным адбіткам.
Зрабі тры крокі наперад і жахніся
З майго атручанага аблічча.
А вось і паратунак:
Ты знайшла на падлозе цукерку.
Хіба толькі салодкі смак яе
Падорыць табе
Прыемнае пачуццё перамогі
Над маёю хвораю ўяўнасцю.



* * *

Калі яго спыталі,
Дзе пачынаецца
Мара
        Мараў,
Ён адказаў:
“Там, дзе
Мора
Ператвараецца ў
Мрою”.



* * *

Сцерці
Састарэлую
Усмешку.
Пачынаецца
Шуканне
Іншай.



# EGO

Працэс
Замалёўкі
Уласнага
EGO
Здаецца
Крыху
Істэрычнаю
Справай,
Бо з правага боку –
Шмат прымхлівай
Мімікі,
А з левага боку –
Шмат нуднай
Эпікі.



# Пералёты АД – ДА

Раптоўныя палосы
Чыіхсьці пальцаў –
Не, не рух маіх
Пералётаў
Ад нечаканасці
Да небязмежнасці,
Ад наднябёснасці
Да чорнай мяккай
Раллі.
Але былі,
былі,
былі
Пералёты.



## Рытм-спеў

Пясочная
  Пяшчота
    Пякучых,
      Палюючых,
        Пануючых,
          Пачынаючых
Рук.



## Герда да Кая



Нічога не ча-
кай — чакай.
Кай, Кай, Кай
Не ад-
шукае
Герду.
Ён шукае
Гер-
ду.
Дурнотны
Момант
Ашуканства.
Дубэльты
Ад-
чыніць!
І дубль
другі
зрабіць!
Шу-
Каць
не
Кая
Будзе ге-
раічна
Герда.

## Хваробны палёт

Доля
далоняў
Падала
долу.
Мне
не хапала
Ўжо
валідолу.
Воля
далёкіх
валоў
Згвалтавана –
Волаты-зверы,
Волаты-плямы.
Зноў
валідолу
Мне
не хапае.
Звон
каляровы
Змучаных
з'яваў –
Зона
заезджаных
Трэснутых
дыскаў,
Зона
наўмысных
Ртутных
уціскаў.
Дрыжыкі
пальцаў,
Спробы
палёту
І неаднолькавых рук
Пераплёты.

# Гама

ДО –
допісы
доўгіх
допытаў.

РЭ –
рэквіем
рэакцыйнага
рэзанансу.

МІ –
мінімальнае
мігценне
мілагучнасці.

ФА –
фальшывая
фантазія
фатальнасці.

СОЛЬ –
салёнае
сола
Сальеры.

ЛЯ –
лямант
лядовай
ляноты.

СІ –
сівер
сімпатыі
сіняй.

ДО.



# Накрый мяне коўдрай

Накрый
Мяне коўдрай,
Зробленай
З рыбінай
Скуры,
На краі
Крывой
Крыгі,
На краі
Крывянога
Кранання.
Крэйдай
Крэслі
Крыніцу
Кратаў маіх
Крыўдлівых
І накрый мяне
Коўдрай
Не з рыбінай
Скуры,
А з першых
Кветак
Сакуры.



# Канфеці:
## спосаб вытворчасці з дапамогай дзіркаколу

Перфарацыя
Ліпкіх успамінаў,
Перфарацыя
Глянцавых спінаў,
Перфарацыя
Спужаных твараў,
Перфарацыя
Акуляраў,
Перфарацыя
Зрэбных кашуляў,
Перфарацыя
Хуткай куляй,
Перфарацыя
Першых абдымкаў,
Перфарацыя
Рэнтгеназдымкаў,
Перфарацыя
Рук суседа,
Перфарацыя
Стрэльбай дзеда,
Перфарацыя
Дзіцячай цацкі,
Перфарацыя
Знянацку,
Перфарацыя
Белых далоняў,
Перфарацыя
Броваў і скроняў,

Перфарацыя
Думак і словаў,
Перфарацыя
Без умоваў,
Перфарацыя
Сціснутых пальцаў,
Перфарацыя
Перфарацый.



# Бензінавыя вясёлкі

Вясёлкі ў небе?
.....................
Не,
На зямлі –
На мокрым асфальце –
Мноства,
Безліч.
Пад нагамі
Расплывуцца
Спектральныя плямы.
Пад нагамі
Памножацца
І распаўзуцца.
Мноства,
Безліч
Тэхнічных вясёлак
Ліпнуць
Да
Падэшваў прахожых,
У вочы
Пырскаюць,
У люкі
Сцякаюць,
Неба не прагнуць
І сонца не прагнуць.
Толькі тут –
На зямлі –
Прытулак.

Толькі тут —
Сярод нас —
Існаванне.
Толькі тут —
У перакуленым небе —
На асфальце
Бензіну плямы
Радуюць вока
І ўсміхаюцца,
І распаўзаюцца,
І расцякаюцца.







## Сіні дах

Сіні
Дах.

Папяровымі крыламі
Змазаць паветра,
Змяць надвячорак
І ноч не мацаць.

Сіні
Дах.

Рухі рабіць адмыслова,
Слова да слова
Чапляць і трымаць
Зорку ў роце.

Сіні
Дах.

Галубоў-жабракоў
Накрыць палітонам,
Хай не пужаюцца
Сціплыя птушкі.

Сіні
Дах.

Там, у суседнім акне,
Дзеці.
Жоўтыя дзеці
Калядаў чакаюць.

Сіні
Дах.

Тут начніцы, сычы,
Матылькі.
Тут пялёсткі,
Цаглінкі і цэгла.

Сіні
Дах.

Руку дай –
Паляцім –
Толькі хутка –
Хутчэй да мяне!

Сіні
Дах.

Дах.

Ах.



## Прадчуванне іржавай пары

Уздоўж
Маіх ног,
Раскіданых,
Іржавыя кветкі
Ярчэлі.
Здавалася,
Дождж
Пойдзе хутка,
Таксама іржавы:
Іржавыя кроплі
Па твары
Сцякалі б
На
Іржавыя кветкі.
Іржавыя кветкі
Хілілі б галовы,
Пялёсткі
Клаліся б
На
Паверхню
Іржавай зямлі.
І неба іржава
У твар пазяхала б,
І сонца
Іржавыя промні
Даслала б
На
Іржавае цела маё.
........................
Не,
Гэта не восень,
Хутчэй —
Прадчуванне
Іржавай пары.

# Крама. Чарга. Доўгая. За нечым.



Крама.
Вітрына.
Касірка.
Чарга.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Я.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Нехта.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Спрэчка.



Крама.
Вітрына.
Касірка.
Сварка.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Бутэлька.



Крама.
Вітрына.
Касірка.
Трэба.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Набыць.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Штосьці.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Паесці.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Чакаю.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Хапіла.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Грошы.




Крама.
Вітрына.
Касірка.
Чэк.

Крама.
Вітрына.
Касірка.
Прэч.



* * *



Маленькія рукі
Рукі-маланкі
Шкрабуцца ў дзверы
Да дзіраў
Дарма
Даруе пякучы мне
Нецалунак
Яна – Неяна – Неён –
Немая





## Святочная мітусня
### ля Дома культуры на фоне рыбы,
### якая не прадавалася

Фары,
Мары,
Моры,
Мроі,
Фары,
Фары,
Фары,
Фары,
Моры,
Мары,
Ром
І
Фары,
Мроі
Рыма,
Мроі,
Фарбы,
Фары,
Фары,
Эй-
фарыя,
Фары,
Фарсы,
А-
фарызмы,
Моры,
Мары,
А-
маральна,

Моры,
Мары
І
Марыся,
Фары,
Мары,
Моры,
Мроі,
Фары,
Фары,
Фарш
І
Рыба.







## Патрэбны крылы

Дзвярэй няма,
Ёсць толькі дзіры,
Ёсць толькі сцены,
Столяў тут няма.
Старыя рукі сурдапераклады
Незразумелых словаў
Робяць тут здаўна.
Тут кожны
Апранае прасціраdла
З паветра цёмнага,
Як брудная вада,
І кожны тут
Натоліць смагу
Глытком
Зялёнага пітва.
Але дзвярэй няма,
Ёсць толькі дзіры,
Ёсць толькі сцены
З ценяў тут
І змрок.
Калі сюды
Захочаш трапіць,
Ведай:
Патрэбны крылы
І не трэба ног.

# Арыенцір на цябе



Другой
Дзеі
Не будзе.
Зімовыя
Памідоры.
Вавёрка
Чысціць
Ліхтар.
Сёння
Без
Газы.
Вячэра:
1 страва,
Вечар:
1 страфа
+
Ля ўнітаза
Чытаць.
Бярыце
Цукеркі:
Дзве па адной
На руку.
Дэнатурат –
Натуральна,
Піць не буду.
За шафай
Хвост –
Туды котка.

Лыжкай
Луп-луп-луп
Па ілбе
Ад
Млявасці,
Кубак –
Бац.
Цыбулю браць,
Каб
Пралілося
Пітво
З вачэй.
Хай бы
Сабе
І
Так.


Прасаваць
Трусы,
Прасоўваць
У трусы
2 нагі,
Без рук.
23 гадзіны.
23 гадзіны.
А першай
Гадзіне
Буду.
Я буду
Першы.
Ты
Бяры
Саксафон
І пачынай.
Далучуся.
Прррррр.

Бутэлька
Гойдаецца –
Дурная
Пачвара.
Твар.
Твар
У талерцы,
Як выспа.
Бяры тут.
Ляжыць.
Збяжыць
Усё роўна.
Мне
Ламаць
Твой
Стул.
Не памыю.
Не памыю
Яго.
Ветразь
Тваёй
Спадніцы
Дрыжыць –
Значыць –
Жыць!
Горш
За цябе
Пацук,
Мой унук.
Тут
Хораша!!!



# Дэградацыя вясёлкі

Перакулілася вясёлка.
...........................
Рассыпаўся спектр.
...........................
Збіраю колеры-шклечкі
І намазваю іх на сцены,
Каб атрымаўся
Святочны бутэрброд.
...........................
Прыйшлі людзі.
...........................
Прынеслі пітва.
...........................
Пачалі распранацца.
...........................
Усю ноч
Дэльфінападобныя істоты
Скакалі і галасілі.
Вясёлкавы бутэрброд
З'елі хутка,
А сцены гэтага
Не вытрымалі:
Пачалі горбіцца,
Выцягваць спіны –
Хацелі стаць вясёлкамі,
Але ў іх не атрымалася:
Шпалеры былі
Чорна-белыя.
...........................
Людзі лямантавалі.
...........................

АРЦЁМ КАВАЛЕЎСКІ

Апраналіся.

.........................

Білі бутэлькі.

.........................

Сыходзілі.

.........................

У шклянцы
З рэшткамі пітва
Квола-чэзлая
Вясёлка
Ванітавала
Страціўшымі колер
Колерамі.



# Мая Крыся
## (сон)



Валасы.
Кардамон.
"Спі–засні".
Тэлефон.
Не хацеў
Пакідаць
Нецярплівую
Памяць.
Па сцяне,
Па сцяне
Павукі –
Да мяне.
Пакрысе,
Пакрысе
Стала цяжка
І
Не.
Гадаваць
Неспакой
Ды прыгадваць
Гады,
Калі быў
Я не той,
Калі
Ты
І
Не ты.
Разадраць
Да крыві



Рану
Ад камара.
Карамель,
Карнавал,
“Спі-засні”,
“Спі-трывай”.
Не кранай,
Не кранай
Каралеўскую
Здань,
З далі
Ў даль
Паглядай
Ды злятай,
Ты злятай.
Злютаваным
Вачам
Галізну
Аддавай,
Чараду
Галубоў
Кармі,
Саогравай.
“Спі-засні”,
“Спі-пачуй”,
“Спі-глядзі”,
“Спі-адчуй”.
Пі
Атручаны
Жах,
Спі-прачніся
У снах.
Да мяне,
Да мяне
Ўсе смаўжы

Ды кукляркі,
Пра мяне,
Пра мяне
Пяюць
Птушкі
Ў альтанках.
Мільгануў
І не знік
Заўчарашні
Мой
Здзек.
Буду,
Буду
Будзіць
Неба
З веку
У век .
Шклечкі,
Лыжкі,
Відэльцы
(Нешта
Хутка
Сышло) –
Лыжкі,
Кубкі
І смецце,
Кніжкі,
Чаркі
І шкло.
Пацалунак
У бездань,
Пацалунак
У століь,
Пацалунак
Без межаў,



Пацалуй –
І пад стол.
Дошкам –
Нас,
Целы нашыя –
Дошкам.
Дождж
Не зможа
Прыцiснуць
Да зямлi
Асцярожнай
Нашых
Целаў
Празрыстае
Склiзкае
Цела,
Прасцiрадла
Халоднае
Нас
Не займела.
Нам
Прасцей
Захiнуцца
Ў блакiтныя
Хвалi,
Што
Гадоў сто
Таму
Нас
Вось тут
Пахавалi.
Нам
Прасцей
Быць
Няпростымi



Хмурнымі
Дзецьмі.
Нам
Прасцей
Не хацець,
Чаго хочацца
Дзецям.
Тут –
Збялелы
Халодны
Прыпынак,
Знойдзем
Тут
Мы
Збалелым
Нагам
Адпачынак.
Тут –
"Спі–засні",
"Не прасі",
"Не прачніся".
Тут –
Паголены
Твар мой
І твой,
Мая Крыся.

# Праз бессмяротнасць



Рабілі
Шкляныя
Пацеркі
Хуткіх
Уцёкаў.

Згубілі
Празрыстыя
Лесвіцы
У
Бессаромнасць.

Знайшлі
Адмысловыя
Гульні
Праз
Бессмяротнасць.



## Транскрыпцыя пакутаў
### арыштаванага ліхтара

Ліхтар-арыштант
Арыштантліхтар
ТАР-ТАР-ТАР ліха
ХАЛУЙ ХІЛІЎ
ХА-ХА-ХА
Ліў танны ТАН
Штаны ліхта-
роў
РОЎ
РОЎ
І
Рышта зрэшты
хтарыў
Хта
Хта
Хто
Ліхтар?
ТАР арышт?
ТАР АРЫ?
ТАР Ы?
ТАРАРЫ!
ЛАР-АРЫШ-Т?!
І. ХТАР-ары-штант
І. Хто-рарыш-тан
І. Хтыра-рышт-ан
Т-Т-Т-Т-Т-Т-Т-Т

Т-Т-Т-Т-Т-Т-Т-Т
Ліхтарарарарарарарарарарарарарарарарарарарара
Л І Х
Т А Р
А Р Ы
Ш Т А
Н
Т
Арыштантліхтар

АРЦЁМ КАВАЛЕЎСКІ

* * *

Рыбіны сны
У кансервавым
Слоіку
З алеем
Змяшаліся
І з соллю.

## Ратацыя для Юрыя Гагарына

Сонца плавілася
На паверхні
Сталёвай ракеты.
Промні чапляліся
Да яго –
Чалавека.
Усё святло ўвайшло
У твар малады –
Праз гады,
Праз стагоддзі
Ён будзе такі.
Тут – адзін.
Тут – адзіны.
Але там –
Памножыўся,
Там –
Раздрабіўся
На мільярды
Мільярдных "Ю.Г."
Вертыкалі прасторы,
Паветра
Праз сябе прапусціў,
Як іголкі,
Потым –
Пазбавіўся вонкі.
Вунь які
Дасканала-маторны
Чалавек-фотаздымак!
Старт –
Яшчэ
Ды яшчэ
(Але гэта – не зараз).
Ён –
Першы цвік
У нябесных дошках,
Шыльда
На блакітных дзвярах

З надпісам "Ю.Г."
І – паўсюды –
"Ю.Г."

Дакрануўся.
Ю.Г.
Ю.Г.
Ю.Г.

Далучыўся.
Ю.Г.
Ю.Г.
Ю.Г.

Здолеў.
Ю.Г.
Ю.Г.
Ю.Г.



Вярнуўся.
Ю.Г.
Ю.Г.
Ю.Г.
..............................
Дзяўчынка гучна
Пракрычала
Маці на вуха:
"Ю.Г."
..............................
Рэха –
Ю.Г.
..............................
Там
Ю.Г.
..............................
Безапеляцыйнае
"Ю.Г."
..............................
Ю.
Г.

## Сонечныя апёкі

Уверсе было
Сонца,
Пад нагамі –
Сонца,
З усіх бакоў –
Сонца,
Усюды –
Сонца.
І я –
Таксама сонечны –
Ператварыўся
У празрыстую
Пляму-пляміну,
Якая рухалася –
Неяк дзіўна плыла –
Па абцякальнай паверхні
Недапаленай зямлі.
Я перамяшчаўся,
Пакідаючы ярка-белыя
Апёкі там,
Дзе запавольваў сваё
Сонна-сонечнае блуканне.
Стары, які стаяў
У той час ля дарогі,
Заўважыў,
Як павольна падняўся
Я ў паветра
І знікаў, знікаў
Там – ля гарызонту.

Ён яшчэ доўга сачыў
За маім белым-белым
Ледзь заўважным
Лунаннем
Па-над неабсяжным полем,
Па-над статкам кароваў,
Па-над усім,
Што захоўвала гарачы подых
Празрыстых, распаленых
Сонечных апёкаў.



# Брудны гарадскі трыпціх

I
Тут
Брук.



II
Тут
Бруд.



III
Тут
Бррр!!!







# Самнамбул



Хістайся,
Адхіляйся
І –
Не адчыняй
Нікому
Сёння.
Хай
Шоргат,
Гукі
І
Яны
Так прагнуць
Сціснутых
Далоняў.
Ваду,
Гарбату
І
Віно
Пі
Асцярожнымі
Глыткамі,
І хай
Бянтэжыць
Ноч таго,
Хто
Не знайшоў
Чаканай
Здані...

А
На
Пахіснутай
Сцяне
Ўжо
Пачынаюцца
Спектаклі.
Ты
Стой
Насупраць,
Як у сне, –
Самнамбул
Не сваіх
Жаданняў.



* * *

Аднойчы
Вось тут,
На падлозе,
Вячэру
Зрабілі
І свята.
А ў госці
Прыходзіла
Восень
І ў вочы
Глядзела
Заўзята.



## Апошняе сонечнае зацьменне тысячагоддзя
**(развітанне)**

Апошняе.
Праз хмары.
Яблык –
Потым луста.
Праз гвалт
Стагоддзяў,
Прадказанняў.
Апошні серп.
Без прымхлівасці
Чорнай.
Апошняе.
Праз шкло,
Праз чорна-вэнджанае.
Апошняе.
Усім –
Праз кантынент –
Да краю.
Апошняе.
Глядзім у неба
І кранаем.
Апошняе.
Вачам
Не хопіць
Смагі.
Апошняе,
А там –
Зноў сонца
І –
Чаканне.

# Паведамленне

“Валасы
Адраслі.
Мае адрасы
Пракіслі.
Вусы,
Быццам вусені
Ўвосень.
Босыя сны
Сталі студняй” —
Студыя сурдаперакладаў
Паведамляе.



# Эвалюцыя некахання



Хлопчык.
Школка.
Ў першы раз.

Хлопчык.
Хлорка.
Унітаз.

Хлопчык.
Двойка.
Больна біць.

Хлопчык.
Дзеўка.
Не любіць.

* * *

Бярыце сякеру:
Пойдзем у лес,
Пабудуем хату–леснічоўку.
Будзем жыць ціха,
Як сычыкі вераб'іныя,
Як хохлікі дзіўныя,
Як мышы беражлівыя,
Як смаўжы павольныя,
Як хвашчы зялёныя,
Як вавёркі хуткія,
Як ктыры гарбатыя,
Як вужакі спрытныя...
Ці проста
Як бясформенныя кладоніі.



# Банальны крызіс усіх узростаў

Дзіцячым гульням
Не будзе канца:
Лялькі,
Хованкі,
Калейдаскопы.

Дарослым вачам
Не будзе спакусы:
Лялькі,
Хованкі,
Калейдаскопы.

Старым забабонам
Не будзе месца:
Лялькі,
Хованкі,
Калейдаскопы.

Усім узростам
Не хопіць глупства:
Лялькі,
Хованкі,
Калейдаскопы.

# Палітычнаактыўнай моладзі

Зося –
Запалітызаваны
Зомбі.



## Учынак

Зноў –
Сон,
І "кар-кар-кар" –
Варона.
Ікар –
Да сонца,
Я –
Да столі.
Скок-скок –
Перамагае
Сціпласць;
І я –
Да ложка:
Спаць-спаць-спаць,
Мікстуры
Лыжку:
Моцным
Стаць.
А потым –
Зноў
Перамагаць.
Нагой –
У сценку,
Ў сонечную
Пляму:
Прастору
Проста
Прасаваць.

Рабіць
Нябачныя
Уцёкі
Ад стомленай
Будзённай спёкі,
Знайсці
Няздзейснены
Учынак –
Нямым быць,
Але
Не
Маўчаць.







* * *

Куды засандаліла
Свае сандалікі,
Босая?



# Восень

Дахі шэрыя.
Салома.
Радыятар.
Вёска горбіцца.
Бабулька.
Авіятар.
Парашуты–птушкі,
Птушкі–лісце.
Восень здзіўлена
Шукае выйсце.

* * *

Ваза –
Вазок
Для фруктаў.







## Накцюрн

Ты дорыш мне
Залатыя яблыкі
Ў кошыку
Пераплеценых пальцаў.

Ты гаворыш мне
Залатыя словы,
Што ўліваюцца
Ў студню пачуццяў.

Ты глядзіш на мяне
Залатымі вачыма,
Што блішчаць
Прадапошнім сумненнем.

Ты так любіш
Залатую восень
І накцюрн наш з табою...
Асенні.

* * *

Вокны
З ватай
Ў вушах
Не пачуюць
Арганнай
Зімы.





# да
# ждж
# ом
**(вертыкальная мінімалізацыя)**



ды
ха
ю
з
ды
ха
ю
з
да
ху
ды
з
до
шкі
да
ждж
ом
сы
хо
дж
у
у
не
тры
тры
ва
лых
лус
таў
зя
млі



* * *

Сон,
Як снег,
Растае
І плыве
Неабсяжнаю
Летай.



# Бяскрылле

Бездапаможнае бяскрылле:
Без мэтаў, межаў, між людзей.
Бездапаможнае бяскрылле
Хаваецца ў бяздонні дзей.
А дзён стракатыя суквецці
Хлуснёй прывабліваюць зноў,
І зноў шукаць адказ у свеце
Даводзіцца праз мройнасць сноў.

# Купанне вясковых кабет

Рака,
Як вялізная рыбіна,
Бы рэптылія-гадаўка,
Срэбная,
У халоднае вадкае
Чэрава
Зноў прымае кабецін
Сукенкавых.
Пляскат хваляў
Свінцова-разбэшчаных,
Хмызнякоў шолах
Ціхі суцешлівы
Прыме зноў
Целы белыя-кволыя
У абдымкі свае
Прахалодныя.
І тады –
Спіны белыя-белыя,
Рукі доўгія,
Ногі магутныя
Захінуцца ў хвалі
Дрыготкія,
І пачнецца
Звычайна-маркотнае.



## Ліквіднасць

Абсалютна
Ліквідная
Вадкасць
Пацячэ
Асцярожна
На рукі,
На твае
Безыменныя плечы,
На мае
Ледзь прыкметныя
Вусны,
На твае паралельныя
Ногі,
На мае бінтаваныя
Пальцы,
На калені твае
Не пад пледам
І на спіну маю
Не пад швэдрай,
На падлогу
Без чорнай коткі,
На дарогу
Без белых патыліц,
На зямлю,
Што без нас святкуе
Надыход зімы
Паўжабрачай.

Выбачай.

Пацячэ
Ліквідная
Вадкасць,
Змые
Сталасць
І старасць,
І вартасць...



# Імправізацыя # 1

(Імправізуй, чытач! Запаўняй прабелы, дзіркі ды іншую прастору твора сваімі ўласнымі малюнкамі–словамі–тэкстамі!)

калі сонца промнем чапляе
вока
недзе далёка
робіцца цёмна
і
страх
( не жах)
там пануе
там
робіць скрыні для нашага жалю
(не дамавіны)

бывайце, мае
сябры
цукеркі
і бот
з нованароджаным мышанём
я
паляцеў
на мора
да выспаў
зялёных
да рыбаў
ніколі не вэнджаных

## Імправізацыя # 2
**(Вясна ідзе!)**

рот поўніцца прадчуваннем
смачнае
ВЯСНЫ
гэта нібыта
СНЫ
рассыпаныя на ложку
(не сабраць лыжкай)
мне зоры на плечы фольгу паклалі
самі — знікалі
а я — знерухомеў
меў
галаву
пад падушкаю
пад коўдраю —
цэлае цела
цэнтр распрацоўкі
фантазій —
у
тазе
які
здавалася
б
толькі
для
сугрэву
ног

я
мог
пайсці спаць на
дах
да птушак
але там стала скакаць
ВЯСНА

пажэрла ўвесь
снег
і

званітавала
першым дажджом



* * *

Барані
Мае
Карані,
Барані,
Як каралі
Свае,
І рабінавы
Сок
Дапі,
Барані,
Небараку,
Мяне.
Захавай
Свой засцюжаны
Крык,
У кішэню
Руку
Пакладзі,
І знайдзі там
Заржаўлены
Цвік,
І маё нешта
Там знайдзі.
У нябёсах
Ізноў
Маладзік
Лустай
Жоўтаю
Бэсціць
Падман.
Сваю поўсць
Ноч
Разгортвае
Нам,
Нібы верным
Сябрам-кажанам.

# Шпіталь



Белы
Твар –
Белы
Твор,
Як тварог
На талерцы
Бляшанай.
Бінтаваныя
Ступні
Таптал
Яго:
Шпітальны экспромт.
Дыягназ
Паставілі:
БАЛЬ.
Проста БОЛЬ
Быў прыемны
Камусьці.

* * *

Дункан –
Дунька
У думках
Сяргея.





# Уначы

Зноў
Распрануты.
Да зор –
Рукамі.
Не шукаю
Глебы на зямлі.
Ты вазьмі
Прытомнымі
Рукамі
Гэты гвалт
Няцёплае ралі.
Ад ралі –
Гракі,
Бы плямы,
Як кавалкі
Вэнджаных спадніц –
Адлятаюць,
Таюць
І адразу
Хутка ператворацца
Ў начніц.
Зноў распрануты.
Да зор –
Рукамі,
Зноў шукаю выйсця,
Быццам котка мыш,
І дзяўбу,
Дзяўбу
У камень
Не нагою –
Носам.
............................
Ты не спіш.

# Трыю

Струны
З труны –
Тры жылы
З жалеза –
З жару
І жаху –
Заенчылі
Тры.
І ад трымцення
Трывалага
Страху
Не здрыгануліся
Нетры
Зямлі.



# Вясна

Дыямантавае
Судакрананне –
Гэта лужыны
Пад нагамі,
Электрычнасць,
Якая між намі,
Пад здзічэлымі
Ліхтарамі.



# Красавік пачынаецца



Вулкі –
Мокрыя шыі.
Машыны –
Шэрыя
Мышы.

Мы йшлі
Шумліваю
Выспай
Па асфальце,
Хворым
На воспу.

* * *

Калісці моцна
Кульнулі
Адну жырандолю –
Стала яна
Вясновым каштанам
У кветках.



## Земляробу

Зямля –
Лустай –
Да прагных
Вуснаў,
Нага
Раллёю
Усцішыць
Боль.



* * *

Ноч атрымала
Прэмію
Нобеля
За мой
Недарэчны
Шчаслівы
Сон.



## Вадасцёкі – нам

Арганы вадасцёкаў –
Органы горада,
Жылы
Жыцця гмахаў.
Птахам – атракцыя.
Нам – сродак
забачыцца.





# Верасень



Не зразумееш
Холад пальцаў
І ў маім пакоі
Холад,
Вачэй
Замёрзлы погляд,
Танцы,
Якімі вар'яцее
Горад.
І я не зразумею
Пальцаў
Паўзледзянелых,
Паўжывых,
І не пачую
Рытмаў танца,
Якімі вар'яцее
Слых.

# Кастрычніцкае нядбанне

Мне так халодна было...

На лузе стаяў скамянела баран –
Бараніў мае вочы ад сумнай нудоты.

Лістоты нагам не хапала (бо мала),
Нахабна трапляліся бруд і брыдота.

Самота? Не, не яна;
Адно толькі сумнасць, напэўна.

Дарэмна ісці да жывёлы бліжэй.

Ніжэй – толькі човен на хвалях:
Пайду пагляджу.

Падыйду,
        Паплыву,
                Палячу,
Плячыма не зварухнуўшы.

Цішэй!
Бо тут
Ціша.

# Зімовы візіт

Дом мой
Пахне старым цынамонам,
Скарынкай цытрыны зялёнай
І скразняком з падваконня
Зімовым
Сёння.
Прынамсі, так сёння.

Я не сагрэтай далонню
Кранаю прасторы –
Твае валасы, быццам
Хвалі ў заснежаным
Полі.

Адвольна
Не адчуваю
Прысутнасць
Нашых з табою
Адсутных размоваў
У сціплым пакоі.



Свавольнымі
Нашы паводзіны
Стануць, відаць,
Праз стагоддзі.

Ідзі.
Керамічныя поўныя
Кубкі
Ужо схаладнелі,
Састылі.

Сталі такімі
Празрыстымі
Словы жагнанняў –
Жаданняў
Шкельцы апошнія
Ў жменю
Збіралі.



## Горад. Шпацыр. Словы.
**(цыкл)**

Горад мае вочы.
Ён пільнуе нас, назірае і сочыць за намі.
Заўсёды.
Штодня і штоночы.
Горад углядаецца ў нашыя твары.
Нарэшце мы заўважаем гэта.
Нашыя позіркі сустракаюцца.
Мы сутыкаемся.
Вочы ў вочы.
Твар у твар.
Цяпер мы разам.
Свядома, непарыўна.
Горад і мы.
Адвечнае існаванне.

Тут.

Вялікі шпацыр ужо распачаты.
Мы ў вялікім Горадзе.
Вялікі Горад у нас.
Усё адбываецца раптоўна.
Імгненне дасканалага суназірання
ператвараецца ў вечнасць.

Стоп.
...stop...
[ стоп–кадр ]

М А Ў Ч А Н Н Е.

Але яно акрэслена слоўнымі межамі.
Словы прыходзяць на дапамогу.
І вось гучыць доўгі працяглы спеў.
Горад стварыў мелодыю, мы — словы.
Спеў гэты будзе заўсёды.
Штодня і штоночы.
Што ў ім?

Горад і мы.
Мы і Горад.



I

Шпацыр адзначаны соннаю стомай.
Горад знаёмы, места старое.
Вуліцаў сплеценых доўгія рукі,
Пальцы завулкаў у цемры гулкай.

II

Крокі — заўважныя ўсім і нікому.
Крокі праз брамы нямыя — дадому.
Крокі па лужынах, бруку, асфальце...
Крокам заблытаным Горад аддайце.

III

Дамы-дамавіны дамову трымаюць,
Драпежнасць двароў прыхаваўшы ў памяць,
Дзе знікнуць на золку каты і бадзягі
У пошуках сумнай жыцця раўнавагі.

IV

Супакоены сталымі ўжо і астылымі
Дрэвамі, лавамі, сцежкамі, схіламі
Парк у абдымках затрыманай восені
Неба самотна піў белае з просінню.

V

Жабрачкі-вуліцы ледзь не загінулі,
Бо шыі доўгія нямогла выгнулі,
Бо не хапала ім уздыху-подыху
Ад спазмаў людскіх у вечным шолаху.

VI

Кволыя птахі на стомленых дахах,
Страхі і жахі ў бетонных гмахах.
Стой! Адшукай той жаданы прытулак
Сноў сваіх — твой адзіны завулак.

VII

Неяк падманліва свеціць ліхтар
Гораду ў вочы начныя, у твар,
Што прыхаваны пад грымам наўмысным,
Грымам спакусы няўпэўнена-існай.

VIII

Горад свае раскрывае далоні,
Ціха прымае ў чэрава-ўлонне;
Ціха, бо рана яшчэ і — бязлюдна,
Толькі вунь там хтосьці крочыць няўклюдна.

IX

Горад... і зноў ён такі апантаны
Новай ахвярай, у ім пахаванай,
Новым, халодным такім прадчуваннем —
Будучым вечным, заўсёдным маўчаннем.

X

Шэрыя, з плямамі, сцёртыя сцены
Цені лавілі вячэрняе цемры.
Стройнасць абрысаў танула ў паўзмроку:
Строгія рысы адкрыліся воку.

# Зіма

Дзікі такі
Маладзік
І драпежны.
Гэта не снежань
З лязом у руках –
Люты свежы.
Мёртвыя
Сцёртыя
Сцены
Нябелае вежы.
Межы цярплівасці –
Ціхія, простыя
Межы.



# Сляды

Зноў
Знікне
Знакаў
Павалока,
Рукі
Знаёмы
Дотык
Неадчуты.
А словы
Пойдуць
Вандраваць
У нечы
Чужы пакой,
Такі аглухлы,
Доўгі...
Тут толькі
Застанецца
Безліч
Бяскроўных
Прывідных
Слядоў –
Нібы
Снягоў
Апошніх
Пасмы –
Мы іх
Калісьці
Называлі
Сноў
Вешчунамі.

І зноў,
Нібы
Усё
Сцякае
Ў час...

.......................

То час
Так велічна
Знікае.







* * *

Апоўначы —
маўчы.
Ўцячы —
учынак просты.
Ўдалечыні ўначы
мы сустракалі ростань.
Куды ісці —
скажы —
І пакажы шлях просты.
Апоўначы, ўначы...
Я —
побач,
Я —
наросхрыст.



# Лета

Лета –
Цытрынавы суп
Разагрэты –
Па свеце
Разлілася
Вадкасцю гэтай...
Кабеты крычалі:
"Ура!"
І спаўзалі
На рукі
Сваіх кавалераў
(Як на парукі).
Колер іх твараў
Мяняўся.
Радасна, жарсна
Рабілася ўсім,
Хто па леце
Ішоў надта смела.
Ў свеце такое –
Мо раз –
Адбываецца...
(Не – лепш – здараецца).
Потым
Схаваецца лета
У Лету,
І кожны
Сляпым кажаном
Будзе лётаць у сцюжы
Салёна-шалёнай...

* * *

Злы
Золак.
Зоры
Згаслі.
Сны
Распусціліся
Каваю
Прэснай.
Думкі
Пракіслі,
І стала ясна:
Ноч
Развіталася
З поўняй
Балеснай.



# Тым дымам…

Дымам
Дыхала
Ты,
Тыкала
Пальцам
У сподак
(Бы папяросу
гасіла).
І галасіла.
Навобмацак,
Хістка і ціха
Рухі рабіла,
Рукі сплятала,
Ішла,
Адлятала…
Мала журбы,
Сэнсу мала…
Мацала
Так апантана
Той фотаздымак,
Дзе мы
Не ў абдымках,
А ў дыме…
…………………
Дыхала
Дымам тым
Ты.



## Снежань

... чаканне Калядаў
І скутыя–скутыя плечы,
І вязкая цемра
Ў сірочай такой халадэчы.

Імя тваё – побач,
А словы твае – там – далёка...
І зноў толькі ноч
І нямыя радкі з–пад алоўка.



# Новы год

Свята
Заўзята
У вочы
Зірнула
І слізганула
Кудысьці
У выйсце.
Свята
Памята
Мой дом
Пакідала
І памірала
Ў прастрэленым
Ліфце.



# У Новы год



Шлях млечны
Неасвечаны.
Малочны вечар –
Малодшы ночы брат
Стрыечны.
І свечкі ценькія,
І вернасць–вечнасць,
І словы страчаныя:
"Да сустрэчы..."

* * *

*O. R.*

Перакрыжоўваючы ніткі памяці,
Тку прасцірадла суцэльнай самоты
І адзінкавасці хвілін дзіцячай радасці.
Прарасці неспакою зярняты
Паспелі цяпер,
А карэнне — глыбока ў нетрах:
Так моцна, упэўнена, жарсна нават,
Трымае вось тут апантана
(Мяне апантанага).
Вось тут —
У абдымках брыдотнага пошуку
Простай патрэбнасці.
(Ну, а зараз куды йсці —
кудысьці...)
А як было добра, калі
Ноч не здавалася ноччу,
Толькі ціхмяным прытулкам,
Утульным ды цёплым (не цёмным).
І дым папяросаў салодкім быў.
Сніў я тады адмыслова...
Слова апошняе
Простым, будзённым было
І салёным —
Сола апошняга слова.
..........................................
Бывай.
Застаюся.

# Рыбы

Бязмоўныя, халодныя і вытанчаныя,
Такія прыгожыя, самотныя і самадастатковыя,
Апранутыя ў бліскучыя срэбныя строі,
Абраўшыя адзіноту паўпразрыстага воднага
свету,
Дзе блікі святла сонечных промняў
Запаволеным маятнікам гойдаюцца
Ў водарасцевых пушчах.
Рыбы...
Таямнічыя істоты патаемнага свету,
Даўшыя зарок маўчання —
Знак згоды з усім Сусветам.
Рыбы...
Адвечныя суназіральнікі і носьбіты
Заўсёднага спакою.
Рыбы...
Уладальнікі дасканалых, выкшталтных целаў,
Якія рухаюцца толькі наперад,
У бездань невядомай і змрочнай пустэльні.
Ані жарсці, ані апантанасці, ані стомленасці
Ў рахманых рухах, у абцякальных абрысах;
У вачах — ані чакання, ані жадання, ані жалобы.
Але яны — рыбы — не іншапланетныя стварэнні.
Яны зямныя.
Нарадзіўшыся, сталеюць, утвараюць пары,
Нараджаюць дзяцей...
Паміраюць,
Бязмоўныя, халодныя і вытанчаныя,
Такія прыгожыя, самотныя і самадастатковыя...
(А ці людзі не рыбы?..)



# А раптам

Твой
Знік
Апоўначы
След.
Свет
Змяніў
Свой
Колер.
Згас.
........................
А раптам я?





## Як сабака

Праглядаючы старыя лісты,
фотаздымкі,
Журбу–варажбу адганяючы,
Дбаючы пра будучае,
Няздзейсненае,
Наўмыснае,
Хісткае,
Застаюся сабакам бяздомным,
Што глядзіць,
Праглынаючы слёзы,
На сузор'е Вялікага Пса.



# У Вільні

Як успамін,
Як сон,
Як здань,
Мой шпацыр быў
Па родным
Слынным месце.
(Тут племя не–маё цяпер)

Плыў дзень...

І безнадзейнае святло
Мінуўшчыны
У цень ператваралася
Паціху.





* * *



Пляскат душы тваёй
Душыць мяне
І сціскае...
Мабыць,
Вось так
Нараджаецца
Ласка
Ці злая,
Прыкра-сцюдзёная,
Чэзлая нават
Усмешка,
Слова будзённае
І да адсутнасці
Сцежка.

## Люты люты

Ціха
Ліха
Літасць
Сваю
Ліла
Ды мяне
Умыла
Ліўневай
Вадою –
То ў лютым была...
.........................
Горад плыў,
І сніў я,
Як слязьмі
І слотай,
З адзінотай
Поруч,
Апантана,
П'яна
Дыхала
Вясна.



* * *



Горшае –
Быць распранутым
І выкшталцонае цела мець,
Спаць, *а капэла* спяваючы
Басам
(Часам, няхай сабе часам).
Горшае –
Гора гартаць,
Загартоўваць
Нягожае цела.
(Гвалт суцэльны,
Поўны мадэрн,
І пустэча).
Прэч!
Поўны прэч!
Тут галеча.
Уперад!
Ноч–уцекачка
Маўчыць.
Чыніць справу
Світальную
Золак –
Мой сынок,
Бо яго нарадзіў,
Бо не спіцца.
Ну...
А мо час ужо?..
Мо спыніцца?..

Мог яшчэ
Нарадзіцца
І сон —
Толькі стогн
Растаптанае
Ночы.
Вочы —
          вокны —
                    вужы
Па жыцці.
Ці прачнуліся
Дзеці-суседзі
Суддзі?
Ну, ідзі,
Ну, ідзі,
Ну, ідзі ж.
Я прашу.
Без слядоў,
Слёзаў без,
Без вясны —
Бэз вясны
У пакінутым
Часе мінулым.
Пакрысе
Тут настане
Утульнасць —
Тульскага перніка
Смак
І смурод
Растаптанае
Ночы.



* * *

Вецер салёны
Слоў маіх
Сола
Злавіў
І да мора пагнаў,
Нібы хмару.
Там
Па складах
Яго чайкі
Чыталі,
Крычалі,
Сварыліся:
Ім невядомы быў
Сэнс.

# Рыбы Шагала

*Н. У.*

Прагне паветра
Здзічэлая рыба,
Шызая рыба,
Сшызелая рыба.
Рыба – да зораў,
У зорную зону
Трапіла.

...а ля возера –
Козы.



## Зоры

Зоры
Зробяць
Сваю справу
І мяне прыдбаюць
Ціха.
...ліха млечнага
кавалак...
...неба марнага
уздыхі...

Зоры
Ромам
Пахнуць
Сёння,
Зоры –
Зерне паднябесся.
Месяц
Вабіць
Жоўтым рогам,
Ворагам
Спявае песню.



* * *

я
ч у ў
г о л а с
д а л ё к а й
с т о м л е н а й
р а з б э ш ч а н а й
б е с п р ы т у л ь н а й
з в ы ш н а т у р а л ь н а й
н о ч н а ч а р о ў н а й
з л е д з я н е л а й
м а ў к л і в а й
г а д а ў к і
г о л а с
ч у ў
я

## Трыляменні вардакулета ў кольнутым зыне

Вардакулет
Трылямеў
Тры лямы
Не меў
На бертушцы
Ў клабэшчаным
Стонку
Цямрэў
Мандажэнкі
Нардзеў
Укладзёжкі
І рына
Рымтачыў
Рын зень
Калёна зын
Калі
Калёна зын
Тані
Калёна зын
Зынка
Шазынка
Базынка
І волу
Тарэмціў
І волі
Астачыў
І нум
Залужэння
Мяконтай
Артачыў

* * *

Апоўначы –
Шапэн,
А ты –
Праз момант.



## Моўчкі

Раптам змяніліся
Гукі і крокі,
Дрэвы нябесныя.
Потым — аблокі.

Словы патрэбныя
Ўжо не гучалі:
Мы сярод гмахаў
Маўклівых маўчалі.



## Як заўсёды

Блытаю
Мяккія прыцемкі
З ноччу.
Хочаш –
Запалім святло
У пакоі?

Б'ецца начніца
Аб шкло
Тлустым целам.

Ты захацела,
Каб я ў куце
Заставаўся.

Шчыліны ў сценах
Нас не пужалі.
Мы прывыкалі
Да іх паступова –
Прывыклі.

Зніклі абрысы
Празрыстых
Прадметаў і рэчаў,
Значыцца,
Ноч надышла,
Як заўсёды.
........................
Мы пачыналі.

* * *

Дзеля
Чаго
Дзень
Ценем
Целы
Ахінуў
І пазяхнуў
У твар
Халодным
Марным
Часам?
.........................
Ахвярнасць
Мараў
Сталася
Няшчаснай.
.........................
А мройнасць
Сціплая
Прытулак
Не знайшла.





# Самота

Самоту
Ўтоптвалі
Ў зямлю –
Самоту саматужную.

Самоту
Дралі
На кавалкі –
Самоту-здрадніцу.

Самоту
Крэйдай
Скрэмзалі –
Самоту-крывадушніцу.

Самоту
Патапілі
Ў студні –
Самоту судную.

...і зашклянелая самота-нота
загучала раптам...



...і ўсе пачулі гук яе
атрутны...



# Мы – млыны

Мы –
Млыны,
Калі вецер –
У твар.
Рукі
Самі
Знаходзяць
Рухомасць.
Мы тады
На мяжы,
На ўскрайку
Драпежным
Ляжым,
Нібы птушкі,
На хвалях
Дрыжым,
Нібы рыбы,
Пад хвалямі
Дыхаем ціха;
Рэхам
Рахманага спеву
Сябе суцяшаем...
Мы –
Млыны,
Калі вецер
У твар
Пазяхае.

* * *

Снег першы,
Як першыя
Накіды слоў
На паперы;
Толькі яны
Безнадзейна-чорныя,
А снег (чамусьці?)
Белы заўсёды.



## Попел-рэквіем

Шэрым
Покрывам
Попел
Злятае
На твар.
Гэта быў
Такі твор
Паламаных
Мар.
Гэта быў
Такі твор
Паламаных
Рам –
Попел-рэквіем:
Там-тара-рам!
Попел-снег,
Попел-след
І попел-папера.
Попел з'ем
І зап'ю
Я небам.
(Халера!)
Попел
Сыпле і сыпле
Нядбайнае
Неба
На краіну-рыбу,
Дзе ніколі
Не быў.

Шэрым
Покрывам
Попел
Мне ногі
Накрые,
І зламаная
Крыўда
Шлюзы
Адкрые.



* * *

*А. Б.*

У вершах –
Вехі,
Веку агрэхі,
Вечнасць
І вера
Ў шматкроп'ях–цернях.

Цемра –
Бездапаможнае
Рэха –
Кліча,
Але дарэмна...
Даруйма!



# Шапэну

Маўклівасць  
Спыніць час,  
А музыка –  
Адродзіць.



* * *

Крыху шкада,
Што не было
Тут спрэчак,
Талерак бітых,
Шклянак,
Шкла.
А што было?..
Адсутнасць свечак,
Сустрэча ночы
І чаканне дня.



## Дупло

Мне тваё
Няпрыкрае
Жыццё
Будзе
Несалодкаю
Цукеркаю.
Ты вавёркаю
Ў маё дупло
Не імкніся,
Бо нясцерпна то.
Сёння ўвечары
Маркотнае віно
Пацячэ ўздоўж
Пальцаў
Стомленых.
Сто разоў
Маё крыло
Лягло
На тваё,
Ўжо цалкам
Мокрае.
Неаднойчы
Тут спаткае
Ноч
Сціпласць–сцісласць
Вуснаў
Крыўджаных:
Ртоў,
Абсмажаных
Хлуснёю слоў,
Не разыдуцца
Скупыя
Шчыліны.

* * *

Віруе ў нашым пакоі
Такое сляпое,
Такое саспелае –
Наша такое жыццё.
............................
Патанаем....



# Вусны

Твае вусны
Сны збіралі,
Засыналі потым,
Засыналі.
За сцяною ноч сляпая
Не кульгала –
Так хадзіла –
Не старая.
Босыя крычалі
Дзеці,
Галасілі
На ўвесь свет.
У свеце
Не хапала
Толькі калыханкі:
Вусны не прачнуліся
На ранку.



# Ахвяра

Хаваюся
Так непрыкметна
Для ўсіх –
Хаваюся –
Нават хістаюся
Ў прыцемках чэзлых –
Лячу.
Мой капрыз
Марным застаўся.
Трохі баюся
Зірнуць за сцяну
Бела-збалелага
Холаду.
Буду лагодным –
Сябе аддаю
Слотнаму,
Соннаму
Гораду.



## Вясковае, летняе...

Лета
Ляцела
Ля цела
Цяля.





## Бэзавае

Бэзам...
Бэзам замучаны,
А мо засмучаны?..

Цёплымі кветкамі
Крыжападобнымі,
Штучнымі.

Цёмнымі сведкамі
Светлага стану
Прыручаны.

Ведае хто,
Можа, з імі
Заручаны?

Ценем ахутаны
Ціхага вечара,
Вечнасці.

Цернямі млечнасці
Раптам размазаны
Ў шэрасці.

Бэзавы...
Бэзавы прысмак
У прыкрасці.

Сціпласці сымбаль
І ўжо непрыкметнае
Літасці.

# Па начной рацэ



Водар
Водарасцей
Лашчыць
Успамін.
Не самотны
Чорны човен
Быў.
Разам
Пазяхалі
Ў неба
Там —
Аддавалі
Ўсю няпэўнасць
Берагам.
І плылі...
І потым зноў
Плылі.
А над намі —
Толькі матылі
Белымі скрыдэлкамі
Ярчэлі
І ляцелі некуды,
Ляцелі...
І рабілася вакол
Халодна.
Мне было
Прыемна
І... бяздомна.

* * *

Світанак
Танчыў
На сталічных
Гмахах,
І сподак
Поўні
Падаў
У натоўп.
Крычалі
Птахі
На высокіх
Дахах.
Дзень
Штосьці
Вымавіў і –
Змоўк.



## Вандроўка
### (вятранне першае)

На мяжы
Варожай
Варажбы
Зноў
Хістаюцца
Нястрыманыя
Страхі.
Свае спевы
Гарадскія
Птахі
Гараджанам
Ахвяроўваюць
Чужым.
І дажджы
(да жалю ў сэрцы)
Джаляць,
І агні
Халодным бляскам
Мне
Апякаюць
Паўжывую
Памяць,
Прапаноўваюць
Вандроўку
Ў сне.

## Вечар
### (вяртанне другое)

І жаўтлявыя лісткі ляцелі,
І знаходзілі прытулак галубы,
І рыпелі паламаныя арэлі,
І плылі туманныя клубы.

І пустымі падаліся брамы.
Праслізнуў кашэчы чорны хвост.
Непрыемны пах ля віннай крамы...
І такі знаёмы чорны мост.



## Ліпень

Дзень гэты
Сурочыў
Наступны
І плюнуў
У вочы:
Што хочаш рабі.
...быццам чэзлая
доўгая рыба...
Няма мне
Прасторы
Нейтральнай
Для ззяння
Зайздроснага
Срэбнай
Лускою.
Пустою
Мінзуркай
Паветра п'ю,
Б'ю па далоні
Сяброўскай:
"Мы йшчэ
нежывыя!"
(Ўжо піжмы
цвілі).
Кашулі ад поту
Паснулі,
Плячыма
Пасунулі,
Моцна
Прыліплі.

У ліпені так,
Як заўжды,
Памiральна.

* * *

Халодны дом –
Як сто дамоў
Халодных.
Адно імкненне –
Знерухомець,
Ціхім быць,
Віно піць,
Слухаць,
Як стукаецца нехта
Ў дзверы.
Дзе я?



* * *

Страху
Страха
І стракатыя
Промні:
Дзень
Без падзеі –
Такі непаголены.
Мне
Не
Адзенне –
Змрок
Слотнае
Ночы,
Хочаш,
Аддамся ёй?
Ведаю,
Хочаш.
Ботамі
Босымі
Лужыны
Гвалціць,
Ціха, нябачна
І самааддана.
Дна
Не шукала
Адна,
А са мною...
Падалі разам
У неба,
На поўню.

## Прабачэнне

Ноч
Тут –
Побач
Крочыць,
Снег
З'ядае
І выпівае
Сок
Марознага
Неба.
Быў
Атрамантавы,
Крыху атручаны,
Вечар –
Прадцеча
Ночы –
Халоднае слодычы,
Што растае,
Калі плюшчу
Вочы
Тут,
А побач –
Шчодры такі чалавек.
.............................
Прабач...

## Здань

Бездань –
У здань,
А здань –
У дзень.
Цень
Не празрысты
Ужо,
Але ценькі..
Холад далоняў,
Вачэй акварэль...
Ноччу
Прамерзлі
Дзіравыя сценкі.
Здзекам здзічэлым
Дазволены
Баль –
Боль
Адчыняе
Забытыя дзверы,
Зверам крадзецца...
А я – браканьер,
Ноч не аглухла
Ад стрыманых
Стрэлаў.



# Хельсінкі



Дамы–шакаладзіны–льдзіны
І дзіўна
Як хтосьці спявае
На пляцы
Адзіны

Так крыкнулі чайкі
Адчаю ў вочы
Так проста
Бадзяемся
Палім
І крочым

І вылі бутэлькі
На вецер
Разбіта
І поўня ўпала
У хвалі
Нібыта

Мы воўчую песню
Хавалі ў моры
А самі хаваліся
Ў млявасці
Sorry



# Дадому



Больш за адчай
Гэты сёння —
Сонны,
Так растаптаны,
Салёны
Мой крык.
Ім адчыняю
Магутныя брамы
Прапаленых
Успамінаў.
Зноў —
Без нічога,
Без стомы,
Без сілаў
Сніў я,
Як дзіўна
Знікае
Мой колер,
І клейкі язык
Прыліпае
Да паднябення.
Да неба —
Білет
Не ільготны —
І —
Я падаю долу —
Дадому...
... і падаю.

* * *

Блакада...
Не ўмею
Мець нічога.
Блакада...
Твары,
Як тавары,
І дарога.
Блакада...
Пачакаць —
Чакаць
І крыкнуць.
Блакада...
Ціха
Нераптоўна
Знікнуць.



* * *

Толькі
Дзень той
Не нашым
Быў...
Плыў асфальт
Пад нагамі
Толькі...
Столькі
Словаў
І столькі
Сіл...
Разгубіліся...
Раз –
І змоўклі.



## Самнамбул # 2

Самнамбул
Сам
На бумерангі
Мрояў
Паклаўся і
Паклаў
Далоні.
Ва ўлонні
Штучных
Успамінаў
Мінаў сябе
І горбіў спіну.
І крочыў ціха –
Йшоў амаль –
А пад нагамі –
Столь,
Бы сталь.



* * *



Маланкі,
Лаянка
І млявасць...
І – вернасць
Верасню мая,
Як недарэчная
Кульгавасць,
Як мокрая ўжо
Ралля.

# Свет



Кволае
Кола
Пад коўдраю
Б'ецца.
Коціцца
Камень
Жыцця
Зацята.
Тая вар'яцкая
Варыяцыя
Так вось цынічна
Плюнула ў твар.

(А ў руках — цэлы свет!!!)

* * *

Вецер –
Цераз мяне,
Я –
Цераз
Церні –
Да ценяў
Ад ценькіх
Слупоў
Не пражытых
Гадоў маіх –
Гвалт аднастайнасці,
Дзікай такой
Адзіноты.

Ну а ты
Так прыгожа маўчыш,
І, укленчыўшы,
Неба цалуеш...



# Сон

Бляклая,
Бязлітасная
Бездань
Бэзам белым
Вабіла
Хлусліва...

... і вясна была
Тады.

...і плыла
Сонца соннае,
Бо восень сніў я.



## Чужыя

Заслона.
Не будзе
Першых актаў.
Актава
Нашага сыходу
Прагучала.

Па чорных –
Я,
А ты,
Ну, ведаю,
Канешне,
Ты –
Па белых...
Так смела,
Смеючыся,
Уцякаеш
І не чакаеш
Бітваў
Між уласных
Стратаў.
Зноў старт –
Разбегліся...

Мы –
Па сваіх,
Па норах –
Нервы берагчы...

Так лепей
І лягчэй,
І проста.
Уголас –
Ані слова,
Так,
Без слёзаў –
То шэпт душы,
Мізэрнасць цішы...

Разбегліся.
Далёка мы.
Нямыя,
Паўпразрыстыя,
Чужыя.



* * *

Пратаранены,
Траўмаваны
Настрой
Без бэзу!
Травень
Запханы
Ў трамвай –
Ратуйце!



## Радзіма

І слоў бракуе,
Калі ТУТ
Іду,
Ступаю...
Саступаю
Месца
І падаю...
Мяне вязуць
ТУДЫ...
..................
Няўтульна...
Не сагрэцца...



# Чытаць і слухаць

Шнуркі-раўчукі радкоў бліскучыя, ГУ-ляюцца, ГУ-ляючыся, праліваюцца ў вершы. Як трэска ўвесну, бяжыць па іх погляд. Словы, знітаваныя ГУ-кавым і візуальным вязьмом, ствараюць ад-мысловыя загадкі, адгадкі на якія, вясёлыя і забаўныя ці журботныя, меланхалічныя, ведае толькі сам аўтар. Але спроба іх разгадаць, што ўзнікае з першых жа складоў верша, зацягвае, заваблівае...

Зрэдчас Арцём прапануе нам, чытачам, праверыць сваё вобразнае мысленне і стацца суаўтарамі – запоўніць прабелы ў вершах сваім асацыятыўным шэрагам.

Арцём абгрунтаваў уласны шлях мастацтвавання – *логафармізм*, дзе працэс успрымання і ўбірання ў сябе твора мастацтва сам ператвараецца ў мастацтва: перформанс, удзел у пантаміме ці гульні. У кнізе таксама гэты шлях можна заўважыць, але ён заўваляваны паўпразрыстым вэлюмам, сатканым з тонкіх паэтычных радкоў, і чытанне вершаў ператвараецца ў самаперформанс сэнсава-сэнсарных уласцівасцей чытача.

Прасачыце за трымценнем, колераззяннем і палётам МЫсЛЬэНЫХ булькаў, створаных вашай свядомасцю...

Творы Арцёма рытмізаваныя, музыкальныя, і падаецца, што гэткім дзіўным чынам на паперы запісаныя мелодыі. Таму справядліва назваць паэта кампазітарам вершаў...

Серж МІНСКЕВІЧ

# Змест

Інэса Кур'ян.
Вершапогляд Арцёма Кавалеўскага. .......... 5

"Ты сёння ек ў гуморы?.." .......... 9
Стома .......... 10
Дзесьці .......... 11
"Люты. Людзі..." .......... 12
"Хавай у памяць..." .......... 14
Трохвугольныя нерэальнасці .......... 15
Дзесяты – Гамер .......... 17
Прапанова .......... 18
Палёт .......... 19
Нечаканая ўсмешка .......... 20
"На сінім сподку неба..." .......... 21
Эра Аэра .......... 22
Крыжыкі бэзу .......... 23
Бярэмя .......... 24
Кардыялагічна-металічнае ўмяшанне .......... 25
Тры шкельцы .......... 26
Талеркі, ці Нечаканае падабенства .......... 27
Апошняе слова .......... 28
Уяўнасць .......... 29
"Калі яго спыталі..." .......... 30
"Сцерці састарэлую ўсмешку..." .......... 31
EGO .......... 32
Пералёты АД – ДА .......... 33
Рытм-спеў .......... 34
Герда да Кая .......... 35
Хваробны палёт .......... 36
Гама .......... 37
Накрый мяне коўдрай .......... 38
Канфеці:
спосаб вытворчасці з дапамогай дзіркаколу .......... 39
Бензінавыя вясёлкі .......... 41

Сіні дах ........ 43
Прадчуванне іржавай пары ........ 45
Крама. Чарга. Доўгая. За нечым. ........ 46
"Маленькія рукі..." ........ 49
Святочная мітусня ля Дома культуры
на фоне рыбы, якая не прадавалася ........ 50
Патрэбны крылы ........ 52
Арыенцір на цябе ........ 53
Дэградацыя вясёлкі ........ 56
Мая Крыся ........ 58
Праз бессмяротнасць ........ 63
Транскрыпцыя пакутаў арыштаванага ліхтара ........ 64
"Рыбіны сны..." ........ 65
Ратацыя для Юрыя Гагарына ........ 66
Сонечныя апёкі ........ 68
Брудны гарадскі трыпціх ........ 70
Самнамбул ........ 71
"Аднойчы вось тут..." ........ 73
Апошняе сонечнае
зацьменне тысячагоддзя (развітанне) ........ 74
Паведамленне ........ 75
Эвалюцыя некахання ........ 76
"Бярыце сякеру..." ........ 77
Банальны крызіс усіх узростаў ........ 78
Палітычнаактыўнай моладзі ........ 79
Учынак ........ 80
"Куды засандаліла..." ........ 82
Восень ........ 83
"Ваза..." ........ 84
Накцюрн ........ 85
"Вокны..." ........ 86
ДА–ЖДЖ–ОМ (вертыкальная мінімалізацыя) ........ 87
"Сон..." ........ 88
Бяскрылле ........ 89
Купанне вясковых кабет ........ 90
Ліквіднасць ........ 91
Імправізацыя #1 ........ 93
Імправізацыя # 2 ........ 94
"Барані мае карані..." ........ 96

Шпіталь ........ 97
"Дункан..." ........ 98
Уначы ........ 99
Трыо ........ 100
Вясна ........ 101
Красавік пачынаецца ........ 102
"Калісьці моцна..." ........ 103
Земляробу ........ 104
"Ноч атрымала прэмію..." ........ 105
Вадасцёкі — нам ........ 106
Верасень ........ 107
Кастрычніцкае нядбанне ........ 108
Зімовы візіт ........ 109
Горад. Шпацыр. Словы. (цыкл) ........ 111
Зіма ........ 115
Сляды ........ 116
"Апоўначы — маўчы..." ........ 118
Лета ........ 119
"Злы золак..." ........ 120
Тым дымам ........ 121
Снежань ........ 122
Новы год ........ 123
У Новы год ........ 124
"Перакрыжоўваючы ніткі памяці..." ........ 125
Рыбы ........ 126
А раптам ........ 127
Як сабака ........ 128
У Вільні ........ 129
"Пляскат душы тваёй..." ........ 130
Люты люты ........ 131
"Горшае — быць распранутым..." ........ 132
"Вецер салёны..." ........ 134
Рыбы Шагала ........ 135
Зоры ........ 136
"Я чуў голас..." ........ 137
Трыляменні вардакулета ў кольнутым зыне ........ 138
"Апоўначы..." ........ 139
Моўчкі ........ 140
Як заўсёды ........ 141

"Дзеля чаго..." 142
Самота 143
Мы – млыны 144
"Снег першы..." 145
Попел-рэквіем 146
"У вершах..." 148
Шапэну 149
"Крыху шкада..." 150
Дупло 151
"Віруе ў нашым пакоі..." 152
Вусны 153
Ахвяра 154
Вясковае, летняе... 155
Бэзавае 156
Па начной рацэ 157
"Світанак танчыў..." 158
Вандроўка (вяртанне першае) 159
Вечар (вяртанне другое) 160
Ліпень 161
"Халодны дом..." 162
"Страху страха..." 163
Прабачэнне 164
Здань 165
Хельсінкі 166
Дадому 167
"Блакада..." 168
"Толькі дзень той..." 169
Самнамбул # 2 170
"Маланкі, лаянка і млявасць..." 171
Свет 172
"Вецер – цераз мяне..." 173
Сон 174
Чужыя 175
"Пратараненыя, траўмаваны..." 177
Радзіма 178

Серж Мінскевіч. Чытаць і слухаць 179

Літаратурна-мастацкае выданне

АРЦЁМ КАВАЛЕЎСКІ

# АДМЫ**СЛОВЫ**Я ГУЛЬНІ

вершы

Праект і дызайн вокладкі
**Дар'я Чарняўская**
Рэдактар
**Серж Мінскевіч**
Карэктар
**Надзея Шакун**



Падпісана да друку 31.07.2003 г. Фармат 76x90 1/32
Папера афсетная. Друк афсетны. Гарнітура "Europe".
Ум.друк.арк. 7,3. Ул.-выд.арк. 8,2. Наклад 500 асобн.
Замова № 516.

Выдавец І.П. Логвінаў
220050, г. Мінск, пр-т Ф.Скарыны, 19-5
Ліцэнзія ЛВ № 522 ад 16.04.2002 г.
logvinovpress@mail.ru

Друкарня ТДА "НоваПрынт"
220047, г. Мінск, вул. Купрэвіча, 2
Ліцэнзія ЛП № 285, выдана
Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь
па друку 28.07.1998 г.

ISBN 985-6701-16-3

9 789856 701163




Прадчуванне іржавай пары
Накрый мяне коўдрай
Попел-рэквіем
Восень
Пахне старым цынамонам

Арцём Кавалеўскі

АДМЫСЛОВЫЯ ГУЛЬНІ

